**Дзень беларускага пісьменства** з'яўляецца нацыянальным святам і адзначаецца штогод у першую нядзелю верасня.

Традыцыйна свята праводзіцца ў гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання.

Упершыню, у 1994 годзе, свята праходзіла ў старажытным Полацку. Пасля гэтага сталіцамі свята станавіліся такія гістарычна значныя культурныя цэнтры краіны, як Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Каменец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Заслаўе, Шчучын, Рагачоў, Іванава, Слонім, Бялынічы, Капыль, Добруш, Гарадок.

У 2024 годзе сталіцай свята вызначаны горад Івацэвічы Брэсцкай вобласці.

Асноўная ідэя свята – ашчаднае захаванне і развіццё духоўнай спадчыны Беларусі, прапаганда нацыянальных культурных традыцый, паказ іх узаемасувязі са славянскімі вытокамі і з сённяшнім днём, дэманстрацыя сталага клопату дзяржавы пра духоўна-маральнае развіццё грамадства праз падтрымку кнігі і чытання, нацыянальнай літаратуры і кнігавыдавецкай справы.

Штогод на свята збіраюцца тысячы гасцей з усёй Беларусі і замежжа.

Сярод ключавых мерапрыемстваў свята – рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў з Дабрадатным Агнём ад Труны Гасподняй». Экспедыцыя праходзіць па гарадах і вёсках некалькіх рэгіёнаў краіны і завяршаецца ў сталіцы правядзення свята.

Праграма свята ўключае Міжнародны круглы стол з удзелам замежных літаратараў, фінал Рэспубліканскага конкурса юных чытальнікаў «Жывая класіка», навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную гісторыі горада – сталіцы свята, займальныя віктарыны, квэсты, Фестываль кнігі і друку.

Апроч таго, на розных гарадскіх пляцоўках увазе гасцей і ўдзельнікаў Дня беларускага пісьменства прадстаўлены экспазіцыі музеяў і бібліятэк, майстроў народнай творчасці, мастакоў і г.д.

У дзень адкрыцця свята на галоўнай сцэне праходзіць цырымонія ўручэння «Нацыянальнай літаратурнай прэміі».

# Аб Івацэвіцкім раёне

## Адміністрацыйны падзел

Адміністрацыйна раён падзелены на 1 гарадскі і 10 сельскіх саветаў. У складзе раёна 107 сельскіх населеных пунктаў, гарадскі пасёлак Целяханы, гарады Івацэвічы і Косава.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла на 2005-2010 гг. 15 сельскіх населеных пунктаў раёна добраўпарадкаваны ў аграгарадкі.

## Геаграфія

Горад Івацэвічы размешчаны на правым беразе ракі Грыўда, за 136 км на паўночны ўсход ад Брэста і за 206 км ад Мінска. Івацэвіцкі раён – адзін з найбуйнейшых у Брэсцкай вобласці. Яго плошча складае 2998 кв. км ці 9% ад тэрыторыі вобласці. Працягласць межаў раёна перавышае 250 кіламетраў: з захаду на ўсход 83 км, а з поўначы на поўдзень – 66 км.

Івацэвіцкі раён мяжуе на захадзе з Бярозаўскім раёнам Брэсцкай вобласці, на паўднёвым захадзе – з Іванаўскім, на поўдні – з Пінскім, на ўсходзе – з Баранавіцкім, Ляхавіцкім і Ганцавіцкім раёнамі, на поўначы – са Слонімскім раёнам Гродзенскай вобласці і на паўночным захадзе – з Пружанскім раёнам.

Паўночную частку раёна займаюць схілы Слонімскага ўзвышша, паўночна-ўсходнюю – Баранавіцкая раўніна, паўднёвую – Прыпяцкае Палессе. Пераважаюць вышыні 150-170 м над узроўнем мора, максімум – 203 м (каля в. Жамайдзякі), мінімум – 141 м (зрэз вады воз. Гошча). Карысныя выкапні: торф, гліна, мел, будаўнічыя пяскі, запасы сапрапеляў.

У раёне пераважаюць тарфяна-балотныя і балотныя глебы, якія займаюць 52% агульнай плошчы землекарыстання, 45,8% тэрыторыі раёна складаюць лясы, пераважна змешаныя. Меліяравана 55 тыс. га.

На тэрыторыі Івацэвіцкага раёна размешчана 8 сажалак, 5 вадасховішчаў і 10 азёр агульнай плошчай 4608 га, Агінскі канал, працякае 12 сярэдніх і малых рэк, агульная даўжыня якіх у межах раёна складае больш за 248 кіламетраў. На паўночным усходзе раёна працякае рака Шчара з прытокамі Мышанка і Грыўда, на паўднёвым захадзе – рака Жыгулянка (прыток Ясельды). Самыя вялікія азёры – Выганашчанскае і Бабровіцкае.

Бабровіцкае возера размешчана за 40 км ад г. Івацэвічы, каля в. Бабровічы. Плошча 9,47 кв.км, даўжыня 4,9 км.

Выганашчанскае возера – самае вялікае возера ў Брэсцкай вобласці. Размешчана за 17 км на поўнач ад г.п. Целяханы на водападзеле рэк Шчара і Ясельда. Знаходзіцца на вышыні 153,1 м над узроўнем мора. Плошча 26 кв. км. Даўжыня 7 км, найбольшая шырыня 4,8 км, найбольшая глыбіня 2,3 м, сярэдняя 1,2 м, даўжыня берагавой лініі 21 км. Вадазбор 87,1 кв. км. Гэта трэці па плошчы натуральны вадаём Палесся. Возера ляжыць у натуральным водападзеле рэк Шчара і Ясельда, таму нядзіўна, што яно выкарыстоўвалася для стварэння воднага шляху з басейна Прыпяці ў басейн Нёмана. Праз яго праходзіў Агінскі канал, злучаючы рэкі Шчара і Ясельда.

Агінскі канал стаў брэндам Івацэвіцкага раёна. Гэта самы стары беларускі канал. Пабудаваны ў 1767-1783 гадах па ініцыятыве і на сродкі М.К.Агінскага, ён злучыў праз сістэму рэк і азёр Чорнае і Балтыйскае моры. Даўжыня 54 км разам з Выганашчанскім і Вулькаўскім азёрамі. Большая частка канала размешчана ў межах Івацэвіцкага раёна. Гэты канал з'яўляўся суднаходным на працягу XIX стагоддзя і ў XX стагоддзі аж да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Захаваўся адзін шлюз пры ўпадзенні ў канал р.Шчара. Рэканструявана частка канала ад возера Выганашчанскае да в. Выганашчы – 5 км. На беразе канала ёсць камфортная хата паляўнічага на 14 месцаў.

Сомінскае возера размешчана ў басейне Агінскага канала. Плошча 0,41 кв. км. Глыбіня 33,5 м. Гэта самае глыбокае возера Брэсцкай вобласці. Даўжыня 900 м, шырыня - 650 м. Дно да глыбіні 10 метраў пясчанае.

На тэрыторыі раёна размешчана большая частка (больш за 70%) ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння «Выганашчанскае». Ён створаны ў 1968 годзе з мэтай захавання найбуйнейшага ў Еўропе балотнага масіву на водападзельнай паласе рэк Чарнаморскага і Балтыйскага басейнаў і з'яўляецца найбуйнейшым у Беларусі суцэльным масівам непарушаных балот.

У раёне 3 батанічныя помнікі прыроды рэспубліканскага значэння: насаджэнні карэльскай бярозы ў Івацэвіцкім і Целяханскім лясгасах, Чыстая дуброва ў Івацэвіцкім лясгасе.

У Чырвоную кнігу Беларусі занесены 23 віды раслін і 39 відаў жывёл. Водзяцца лось, алень, казуля, кабан, ліса, заяц-бяляк і заяц-русак, янотападобны сабака, шэрая курапатка, рабчык, слонка, балотная дзічына і інш.